# Па шляхах літаратурных анлайн-конкурсаў

***31 сакавіка адбылося святочнае ўганараванне пераможцаў міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад зоркай Венеры», што праходзіў у рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю».***

Пад час падвядзення вынікаў міжнароднага анлайн-конкурсу «Пад зоркай Венеры», што прайшоў у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, журналістка з радыё «Культура» спытала ў мяне пра яго пачаткі. Пытанне выклікала некаторыя развагі пра тое, як змяняюцца і ўскладняюцца патрабаванні да такіх конкурсаў з кожным разам, як даводзіцца распрацоўваць і рэалізоўваць палажэнні да іх. Гэта як іншыя падыходы да разгляду творчых прац, так і бачанне новых магчымасцяў у размяшчэнні відэазапісаў на розных платформах. Гэтым разам відэа адразу запампоўваліся на афіцыйную старонку Ютуб-канала Мінскай абласной бібліятэкі, дзе можна было лёгка знайсці запіс, прагаласаваць за любую творчую працу і напісаць каментар.

Гэта трэці анлайн-конкурс, да якога я мела дачыненне і ўдзельнічала ў яго арганізацыі і правядзенні. Таму вельмі радасна было бачыць на выніковым мерапрыемстве «Пад зоркай Венеры» ўдзельнікаў першага пробнага праекта анлайн-конкурсу чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», прымеркаванага да 120-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі і які атрымаў статус рэспубліканскага. Ініцыятыва праводзілася Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў 2020 годзе пад час эпідэміі Covid-19. Нам вельмі хацелася папулярызаваць новы віртуальны раздзел да юбілею У. Дубоўкі, створаны ў рамках праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця». Пад час конкурсу ўдалося падтрымаць настаўнікаў беларускай літаратуры, для якіх ён стаў стымулам заахвочвання дзяцей творамі беларускага пісьменніка з школьнай праграмы. Творчых прац прыйшло вельмі шмат, а ініцыятыва ў фармаце анлайн дапамагла паўдзельнічаць тым, хто жыве далёка ад сталіцы. Дзякуючы конкурсу дзеці пазнаёміліся амаль з усімі паэтычнымі творамі У. Дубоўкі, многія вывучылі іх на памяць. Было вельмі радасна, што яны не абмяжоўваліся толькі праграмнымі тэкстамі.

У конкурсе «Пад зоркай Венеры», які арганізоўвала ўжо Мінская абласная бібліятэка, удзельнічалі і пераможцы першага конкурсу «О, Беларусь, мая шыпшына». За гэты час яны выраслі, бачна, што яны з цікавасцю ўдзельнічаюць у падобных ініцыятывах, што гаворыць пра спрыяльную глебу, якую заклаў у іх і наш першы літаратурны конкурс.

Міжнародны анлайн-конкурс чытальнікаў «Пад зоркай Венеры» праводзіўся з 1 па 20 снежня 2022 года і быў прымеркаваны да дня нараджэння Максіма Багдановіча. Да ўдзелу запрашаліся дзеці да 18-і гадоў. Актыўнасць і вялікая колькасць яго ўдзельнікаў з'яўляецца лепшым доказам таго, што творчасць М. Багдановіча выклікае цікавасць у дзяцей і моладзі. Арганізатарам выступіла Мінская абласная бібліятэка сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурным музеем Максіма Багдановіча, Выдавецкім домам «Звязда» (газетай «Літаратура і мастацтва»), Мінскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача, Каналам «Культура» Беларускага радыё, Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

На адрас конкурсу з першых дзён паступала вельмі шмат творчых прац. Усяго налічвалася каля 1800 удзельнікаў з Беларусі і бліжэйшага замежжа, таму конкурс і набыў статус міжнароднага. Сярод прац як вельмі прафесійна створаныя відэа з выразнай падачай і артыстычнасцю, старанна падабранымі касцюмамі і дэкарацыямі, вынаходлівым мантажом і выкарыстаннем «храмакея», так і хатнія відэа, зробленыя самімі дзецьмі і іх бацькамі. Для выразнага чытання выбіраліся самыя розныя творы М. Багдановіча. Сябры журы звярталі ўвагу на літаратурнае чытанне, успрыманне твора ўдзельнікам, на правільную расстаноўку акцэнтаў. Былі працы ад удзельнікаў, якія прафесійна займаюцца мастацкім чытаннем.

У сувязі з вялікай колькасцю прац было прынята рашэнне правесці два туры адбору сярод удзельнікаў. Першы тур праходзіў сёлета 20 студзеня – 19 лютага. Сярод усіх удзельнікаў былі выбраны каля 200 лепшых чытальнікаў, якія прайшлі на наступны, фінальны этап конкурсу.

*«Паважаныя арганізатары конкурсу "Пад Зоркай Венеры", шаноўнае журы! Дзякуй вам за тытанічную працу! Прагледзець амаль 2000 ролікаў – гэта трэба столькі часу і цярпення! А галоўнае – любові да сваёй роднай культуры! Бо нічым іншым не растлумачыць і такі наплыў удзельнікаў, і такую самааддачу арганізатараў. Я ўпэўнена, што падобныя конкурсы нам вельмі патрэбныя. <...> Беларуская культура гаворыць вуснамі дзяцей. Багдановіч гучыць сучасна, і кожны прадстаўляе сваё асабістае прачытанне яго твора. І ў кожнага застанецца памяць аб удзеле ў гэтым конкурсе і цяпло ўнутры. І ўжо ніхто не забудзецца аўтара, які напісаў "Здароў, марозны звонкі вечар..." (Юлія Аленькава, г. Магілёў).*

Пасяджэнне сяброў журы і аргамітэта адбылося 27 лютага, на якім з фіналістаў былі адзначаны 40 пераможцаў: ва ўмовах такой высокай канкурэнцыі іх працы вылучаліся большай арыгінальнасцю задумкі і выканання, дзякуючы чаму заслужана занялі свае прызавыя месцы. 28 лютага на сайце бібліятэкі і ў сацсетках былі агучаны пераможцы конкурсу, сярод якіх вылучаны 17 дзяцей з Мінскай вобласці і 2 са сталіцы. Трэба памятаць, што конкурс праходзіў у рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю», але адразу планалася зрабіць яго міжнародным і далучыць дзяцей з іншых рэгіёнаў і замежжа. Акрамя гэтага партнёры анлайн-конкурсу «Пад зоркай Венеры» адзначылі асобныя працы ўдзельнікаў дадатковымі намінацыямі, гэтыя дзеці таксама былі запрошаны на выніковае мерапрыемства для ўручэння ўзнагарод.






І вось 31 сакавіка Мінская абласная бібліятэка сустрэла пераможцаў анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад зоркай Венеры», якія прыехалі ў суправаджэнні бацькоў, настаўнікаў і школьных бібліятэкараў з розных куткоў Беларусі. Замежныя пераможцы Анастасія Еніна, Эвеліна Капітонава і Дар'я Канавалава разам з загадчыцай Цэнтра беларускай культуры «Музей М. Багдановіча» ў Яраслаўлі Натальляй Прохаравай далучыліся да мерапрыемства праз анлайн-эфір і пажадалі далейшых поспехаў пераможцам конкурсу.

Пад час цэрымоніі пераможцы атрымалі ганаровыя дыпломы і «зорку пераможцы», а таксама квіткі на самыя папулярныя спектаклі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача. Былі ўручаны прызы спецыяльным лаўрэатам ад партнёраў і членаў журы конкурсу.

Яркімі акцэнтамі святочнага мерапрыемства сталі выступленні Музычнай капэлы «Санорус» пад кіраўніцтвам Вячаслава Ларына, салістаў, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Уладзіслава Даніловіча і Ганны Янкоўскай Белдзяржфілармоніі, якія выконвалі рамансы на вершы М. Багдановіча. Сваім арыгінальным чытаннем твораў паэта падзяліліся ўдзельнікі народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» пад кіраўніцтвам Алеся Мойскага і Алесі Сівохінай. Зразумела, што святочная праграма не магла абысціся без выступленняў саміх лаўрэатаў конкурсу – вершы класіка прачыталі ўдзельніца ўзорнага дзіцячага тэатра «Вясёлка» Палаца культуры г. Барань Аршанскага раёна Арына Рубановіч і навучэнец аршанскай СШ № 3 імя У. Караткевіча Максім Голубеў.

*«І вось адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння дыпломаў і падарункаў! Арына чытала ... выдатныя вершы Багдановіча. Спявалі прафесійныя артысты, грала жывая музыка! Незабыўныя ўражанні!!!» (кіраўнік узорнага дзіцячага тэатра «Вясёлка» з Барані Людміла Сасніцкая).*

Віншуем пераможцаў анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад зоркай Венеры»! Арганізатары выказваюць удзячнасць усім, хто прыняў удзел у конкурсе – усе вашыя намаганні былі заўважаныя. Не спыняйцеся, працягвайце развіваць і ўдасканальваць свае таленты!

*Таццяна ЛАЎРЫК*